Таким образом, грамматический анализ терминов может дать дополнительные сведения, которые отсутствуют в тексте самого источника, а также разъясняет функции, выполняемые жречеством.

**Литература**

1. *Соколов С. Н.* Язык Авесты. Л., 1964.
2. *Фрай Р.* Наследие Ирана. М., 1972.
3. *Dhalla M.* History of Zoroastrianizm. NY. 1938.
4. Интернет-адрес: http://tenets.zoroastrianism.com/priest33.html

## КВАТЭРНАЕ ПЫТАННЕ МЕНСКА Ў 20-Я гг. XX ст

**Т. Ул. Мірановіч**

На сённяшні дзень у гістарычнай навуцэ існуе разуменне таго, што для поўнага дакладнага адчування той ці іншай гістарычнай эпохі не дастаткова толькі палітычнага, эканамічнага, культурнага агляду. Неабходна разглядаць праблему ўсебакова, у тым ліку, звяртацца і да паўсядзённага жыцця. Дадзеная праца накіравана на тое, каб ахарактарызаваць адзін з аспектаў паўсядзённага жыцця жыхароў Менска, а менавіта кватэрнае пытанне, якое безумоўна застаецца актуальным і на сёняшні дзень. Асноўныя мэта даследвання: праанілізаваць стан жыллёвага фонду Менска ў 1920-х гг. Храналагічныя рамкі вызначаюцца 1921 – 1930гг.

Даследванне ў асноўным будуецца на фактычным матэр'яле крыніц, і ў першую чаргу перыядычных выданняў. Найбольш карыснымі для напісання працы былі штодзённыя газеты «Звязда» і «Савецкая Беларусь», якія мелі найбольшы тыраж у той час на тэрыторыі БССР і найбольш зместоўна адлюстроўвалі грамацка-палітычныя працэссы. НЭП садзейнічаў пэўнай лібералізацыі ў галіне друку, таму мы можам з большай доляй упэўненасці спасылацца на прыведзеныя ў газетах матэрыялы. Да таго ж, падчас адсутнасці глыбокіх даследванняў матэрыяльнай культуры Менска міжваеннага перыяда, ў пэных аспектах дадзеныя газет з'яўляюцца адзінай крыніцай інфармацыі.

Статус сталіцы Беларусі Менск набыў 8 студзеня 1919, у 1920-я гг адбываецца замацаванне сталічных функцый, Менск становіцца навуковым, культурным цэнтрам Беларусі. Спецыфічным было геапалітычнае становішча: у адпаведнасці з Рыжскім мірным дагаворам 18 сакавіка 1921г. мяжа паміж Польшчай і Беларускай ССР праходзіла ўсяго ў некалькіх дзесятках кіламетраў на захад ад Менска.

Пачатак 1920-х гг. для Менска характарызуецца станам крызісу і вялікімі стратамі пасля войнаў. На працягу дзесяцігодзя вяліся мера-

прыемствы па аднаўленню эканомікі, стабілізацыі жыцця. Але матэрыяльнае становішча насельніцтва заставалася складаным. На пачатак 1920-х гг. Менск з'яўляўся адным з самых дарагіх гарадоў СССР. Нестабільнасць цэн, іх хуткі рост былі, часам, большымі чым па ўсёй РСФСР, напрыклад, на лістапад 1922 па цэнах на тавары першай неабходнасці і на харчовыя прадукты Менск стабільна ўваходзіць ў чацвёрку самых дарагіх гарадоў [10, №276 (681) 13 снежня 1922]. Да таго ж, па памерах заробку БССР значна адставала ад іншых рэспублік СССР [3, с. 169]. У гэты час назіраецца дынамічны рост насельніцтва горада. Згодна перапісам, колькасць жыхароў Менска ў 1922г. складала 102375 чалавек, а ў 1930г. – каля 147555, кожны год прырост насельніцтва складаў 7,15% [8, с. 142].

Пад час войнаў, аккупаціі значная частка жылёвых будынкаў была спалена, разбурана, другая частка прышла ў стан нягодгасці, пачынала руйнавацца ( у ацалелых дамах працякалі дахі і прагнілі падлогі, сцены і столі, аселі вуглы, лесвіцы не мелі поручняў, вокны – шкла, большасць печаў не былі прыгодны для выкарыстання). Жыллёвы фонд Менска толькі ў 1926г. набліжаецца да паказчыка 1911г., пасля таго, як шырока былі распачаты мерапрыемствы па будаўніцтву новага жылля. На 1911г. гарадская нерухомасць складала 10300 будынкаў, з 8000 жылымі дамамі [11, с. 89], а ў 1926 – 6763 забудаваных уладанняў з 9728 жылымі будынкамі і 7918 нежылымі грамацкага прызначэння [1, с. 297]. Жыллёвы крызіс паглыбляўся тым, што ў Менску, як у сталіцы, ўзрастала колькасць грамацкіх устаноў. Імі было занята, па розных крыніцах, ад 33% [6, с.12] да 44,8% ад агульнай колькасці будынкаў[1, с.273].

На працягу 1921–1924г. пераважна праводзіліся мерапрыемствы па падтрымцы і аднаўленню захаваўшагася гарадскога жыллёвага фонду. Новага жылля амаль не будуецца, на працягу 1921–24гг. жылёвы фонд павялічваўся практычна толькі за кошт будаўніцтва дамоў індывідуальнай забудовы. Дзяржава дапамагала грашовымі крыдытамі і будаўнічымі матэрыяламі. Індывідуальная забудова пераважае як від жылёвага будаўніцтва, у 1920-я гг. яна складае больш 80% ад гарадской забудовы. Для гэтых мэтаў рабочым і служачым выдзяляліся зямельныя пляцоўкі 0,15-0,6га, распаўсюджаны выпадкі самавольнага захопу зямлі дзеля распачынання будаўніцтва. Забудоўшчыкам рабіліся ільготы, выдаваліся пазыкі да 10 год, па якіх спаганялася не вышэй 3% гадавых. Арэндная плата за участкі не спаганялася да заканчэння трохгадова тэрміну пасля ўзвядзення жылля. Значную частку жыллёвага фонду складалі дамы барачнага тыпу. Узводзіліся яны на ўскраінах горада па некалькі будынкаў побач і складалі пасёлкі барачнага тыпу.

Дзяржаўнае будаўніцтва жылля вялося ў нязначных памерах (у 1923г. яно складала каля 1%) [3, с. 174]. Дзяржаўныя мерапрыемствы па будаўніцтву новага жыллёвага фонду распачынаюцца з сярэдзіны 1920-х гг. Увесну 1925г. у Менску быў адкрыты Беларускі банк Камунальнай гаспадаркі і Кватэрнага будаўніцтва. Банк выдаваў пазыкі жыллёвым таварыствам, крыдытаваў рамонт і паліўныя патрэбы па векселям ці пад залог рухомай маёмасці, найбольш прыемлімай формай пагашэння пазыкі з'яўляліся ўзносы з рэшткаў кватэрнай платы за пакрыццё расходаў таварыства.

Праца па рамонту і будаўніцтву вялася на сродкі, якія адлічваліся ў фонд паляпшэння побыту рабочых і служачых з дзяржаўнай прамысловасці і транспарту. Для адшукання сродкаў на будаўніцтва спаганяўся падатак з лішкаў займаемага пляцу т.зв. «напрацоўнага элемента», у маі 1924г з лішкаў было сабрана 14678руб. 90кап [10, №208 (1205) 9 вер.1924]. А з сакавіка 1925г. уведзена падатковае абкладанне ўсёй жылой плошчы, займаемай непрацоўным элементам [5, № 52 (1962) 4 сак.1925].

Недахоп будаўнічых матэрыялаў стрымліваў разгортванне жыллёвага будаўніцтва ў патрэбных аб'ёмах, асабліва не хапала кровельнага жалеза, сантэхнічнага абсталявання, водаправодных і каналізацыйных труб. Галоўным чынам узводзіліся драўляныя дамы, мураваныя ў 1926г. складалі ўсяго 4,4% ад усіх забудоў [3, с. 170]. Дробнае двух-чатырох кватэрнае аднапавярховае будаўніцтва з'яўлялася даволі дарагім. Да таго ж пасёлкі мелі паўвясковы выгляд з малой шчыльнасцю (120–140 чалавек) на гектар будаўнічай плошчы [7, с.108]. Жыццё патрабавала пераходу на больш буйное, двухпавярховае, драўлянае, шматкватэрнае будаўніцтва. Для забяспячэння працоўных жыллём пачынаюць узводзіцца т.зв. «рабочыя пасёлкі». У 1925г. будаўнічыя кааператывы прыступілі да ўзвядзення некалькіх рабочых пасёлкаў у раёне Ляхаўкі (сёння раён вуліц Свярдлова, Ульянаўскай, Кастрычніцкай), вакзала, пасёлака Камінтэрн (сёння раён фабрыкі Камунарка) і іншых месцах. Першапачаткова гэта было дробнае драўлянае 2–4 кватэрнае аднапавярховае будаўніцтва, пазней – 16 кватэрныя дамы з двума пад'ездамі.

Пачынаючы з 1927г. у планах жыллёвага будаўніцтва паралельна з драўляным з'яўляецца і цаглянае. Першыя з цагляных будынкаў узводзяцца на сродкі кааператываў служачых дзяржаўных устаноў. Гэта былі не вялікія, на 4-8 кватэр дамы, узводзіліся яны пераважна ў цэнтральных раёнах. Напрыклад: жылыя дамы кааператыўнага таварыства «Госбанковец» па вул. Валадарскага (1927), 6-кватэрны дом па вул К. Маркса ля сада імя Профінтэрн (сёння парк імя Горкага)

пабудаваны на сродкі настаўнікаў (1928г.) [2, с.24]. У гады першай пяцігодкі (1928 – 1932гг.) пачынаецца ўзвядзенне шматкватэрных жылых дамоў. Гэтаму садзейнічае павялічэнне выпуску цэглы на прадпрыемствах Менска. На працягу 1920-х забудова была неарганізаванай і хаатычнай, але ўзводзіліся і рацыянальна, эканамічна спраектаваныя дамы: 73 кварэрны дом Наркомлеса па вул. К. Маркса 1928–32гг), два 112 кватэрных дома для рабочых і служачых Чыгункі па вул. Маскоўскай, Кірава [2, с.31].

На прыканцы 1920-х была зроблена спроба ўзводзіць дамы са спецыяльнымі грамацкімы памяшканнямі, такія дамы атрымоўвалі назву дамоў-камун. Але такія будынкі не ўлічвалі рэальных патрэб жыхароў, па некалькі разоў перабудоўваліся, наогул, ў Беларусі не набылі шырокай распаўсюджанасці.

У Менску ў 1920-х гг. камунальныя кватэры не сталі асобнай спецыфічнай формай жылля. Таму што на пачатак 1920 значная частка жылых буйных будынкаў была зруйнавана, на працягу наступных гадоў пераважна ўзводзіліся індывідуальныя дамы-хаты сялянскага тыпу і невялікія, малакватэрныя дамы, па гэтай прычыне не склалася фонду для камунальных дамоў. Па-другое, мелася тэндэнцыя для размежавання кватэр-пакояў у муніцыпалізаваных дамах, якія перадаваліся працоўным. Перад засяленнем рабілася невялікая перапланіроўка, каб размежаваць вялікі пакой, ці кватэру, тым самым зрабіць ізаляваную жылую плошчу, асобны ўваход.

Наогул, у 1920-я гг. назіраўся востры недахоп жыллёвай плошчы. Часам, пад жыллё адводзіліся падвальныя, чардачныя, прыстасоўвалі нежылыя памяшканні. Нягледзячы на пашырэнне жылёвага будаўніцтва, сярэдняя норма жылёвай плошчы на аднага чалавека пачынаючы з 1923г. штогод зніжалася. У 1920-я гг. пачынае складвацца сучасная сістэма забяспячэння жыллём.

**Літаратура**

1. Белорусская ССР в цифрах 1919 – 1929гг. Мн., 1930.
2. *Воинов А. А.* Жилищное строительство в Белорусской ССР. Мн., 1980.
3. Гісторыя Беларусі: ў 6 Т. Т.5 Мн., 2006.
4. Гісторыя Мінска. Рэд. Бабкова У. А. Мн., 2006.
5. Звязда. – №4 (1325) 6 студзеня 1923. – 18 студзеня 1923. – №82 (1992). – № 52 (1962) 4 сакавіка 1925. – №82 (1992) 11 красавіка 1925. – № 149 (2059) 3 ліпеня 1925. –№ 152 (2062) 6 ліпеня 1925. – № 159 (2069) 1925. – №162 (2071) 18 ліпеня. – 1925. – №4 (2213) 4 студзеня 1926. – №: 6 (2216) 8 студзеня 1926 . – №10 (2220) 13 студзеня 1926. –№13 (2223) 1926. – № 28 (2238) 2 лютага. – №30 (2240) 1926. – №31 (2241) 1926. – № 224. 30 верасня 1926.
6. *Ілья Куркоў.* Мінск незнаёмы 1920–1940. Unfamiliar Minsk 1920–1940. Мн., 2002.

7. *Леановіч І. А.* Жыллё рабочых г. Мінска ў даваенны перыяд (1917–1941гг.).// Весці Акадэміі Навук Беларускай ССР № 1. 1974. Серыя грамацкіх навук. С. 104–112.
8. Минск. Краткая хроника:(ноябрь 1917 – 1966).Мн., 1966.
9. Памяць. Мінск у 4–х кнігах. Кніга 3.Мн., 2004.
10. Савецкая Беларусь. – №276 (681) 13 снежня 1922. – № 221 (626) 5 кастрычніка 1922. – №208(1205) 9 верасня 1924 . – №79 (1378) 8 красавіка 1925 . – №81 (1991) 10 красавіка 1925 №133 (1432) 17 чэрвеня 1925.
11. *Шыбека З. В. Шыбека С. Ф.* Мінск.Старонкі жыцця дарэвалюцыйнага горада. Мн., 1994.

## ПЫТАННЕ АБ СУТНАСЦІ І АБ'ЁМЕ АДЗІНАЎЛАДДЗЯ ПЕРШАГА РЫМСКАГА ПРЫНЦЭПСА

**А. А. Рагойша**

Рымская дзяржава часоў Аўгуста – гэта добра дакументаваны гістарычны аб'ект, прыдатны для вывучэння працэсу і прычын пераўтварэння краіны з рэспубліканскай формай кіравання ў адзінаўладную манархічную імперыю, працэсу прыходу і станаўлення дыктатуры. Мэтай дадзенай працы з'яўляецца даследаванне таго, як Аўгуст распарадзіўся вышэйшай уладаю ў Рыме, аналіз сутнасці створанай ім палітычнай сістэмы раннерымскай імперыі ў форме прынцыпату і пошук адказу на пытанне, чаму ён змог правесці мноства рэформ, прынятых грамадствам.

Перадумовы змены дзяржаўнага ладу выспявалі і ў палітыцы, і ў эканоміцы, і ў сацыяльнай сферы Рымскай рэспублікі.

Пасля заканчэння саюзнай вайны Рым пераўтварыўся з полісу ў сталіцу Італіі і міжземнаморскай дзяржавы [1]. Полісная структура з яе выбарнымі магістратурамі не магла існаваць у такой вялікай краіне. Выбары маюць сэнс толькі тады, калі ў іх удзельнічае большасць насельніцтва, якое мае права голасу. Пасля атрымання італікамі правоў рымлян народныя сходы былі немагчымыя па аб'ектыўных прычынах. У той час людзі не прыдумалі прадстаўнічых органаў ўлады, такіх як парламент, таму неўдзел усіх жыхароў у працы цэнтральнай улады паставіў пад пытанне неабходнасць існавання выбарных магістратур.

Крывавыя грамадзянскія войны, дыктатура Марыя, праскрыпцыі Сулы, паўстанне рабоў, першы трыумвірат, другі трыумвірат – усе гэтыя падзеі паказвалі на тое, што, нажаль, Рэспубліка пражыла свой век. Стала неабходным змяніць яе на новую сістэму ўзаемаадносін дзяржавы і народа. Папярэднія дыктатуры праілюстравалі грамадству няправільныя шляхі, і толькі Аўгуст змог стварыць самую жыццястойкую сістэму – быццам сам час праводзіў натуральны адбор.

Што да эканомікі, праблемы канцэнтраваліся ў існаванні полісна-абшчыннай сістэмы, якая не магла забяспечыць рынак таварамі. На